# ЯГО ЛЮБОЎ

## Народнага артыста Беларусі Міхаіла ФІНБЕРГА віншавалі з 70-годдзем

Так здараецца: аднойчы западуць у душу гукі — і ніяк ад іх не пазбавіцца. Утаймаваць толькі адным шляхам: далучыцца. Логіка музыканта. Яна падпарадкавала свядомасць хлопчыка, які жыў у маленькім горадзе. Што было рабіць з ім? Рос у простай сям'і, але бацькі зразумелі: трэба падтрымаць, калі гэта сур'ёзна, то нешта можа атрымацца. Першай прыступкай да прафесіі стала музычная школа ў Мазыры. Горад свайго пачатку Міхаіл Фінберг будзе апякаць ужо стаўшы вядомым дырыжорам: безліч канцэртаў адыграе ўжо разам з аркестрам, створаным 30 гадоў таму.

І гэта яшчэ адна любоў, якая ідзе з ім па жыцці, — аркестр. Іх было некалькі, калі лічыць ад таго, дзе атрымаў першае музычнае выхаванне: пры ваенным аркестры. Марыў стаць «генералам» у гэтай справе, ужо ў Акадэміі музыкі вучыўся як дырыжор. І паступова разумеў, у чым асаблівасць такога калектыву, як аркестр, дзе ў сугуччы розных інструментаў павінна нарадзіцца музыка. Некалькі гадоў іграў у аркестры Беларускага радыё і тэлебачання. І вялікую частку жыцця — ужо як дырыжор — прысвяціў аркестру беларускага цырка. Тады ўжо загучала імя дырыжора. Але хацелася іграць сваю музыку — тое, што адчувалася патрэбным, і тое, што магло б прадэманстраваць майстэрства музыкантаў.

30 гадоў таму яму далі магчымасць стварыць асобны калектыў. Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі. Вядомы як канцэртны. Цяпер — нацыянальны і акадэмічны. Яго гісторыя пра тое, як любоў даказваецца пастаяннай працай. Штодзённай і даволі напружанай. Гэта толькі па тэлетрансляцыі выглядае ўсё прыгожа і проста. Але калі слухаеш адзін канцэрт, то не думаеш, што мог быць яшчэ канцэрт учора, пазаўчора ці тыдзень таму. Прадстаўляць шмат розных праграм за год — гэта дзіўная здольнасць аркестра пад кіраўніцтвам Фінберга, які іграе папулярныя мелодыі і джаз, здольны паказаць сусветную акадэмічную класіку і прадставіць беларускую музыку так, каб яна надоўга заставалася, жыла ў грамадстве. Каб прыйшла любоў да яе.


Фота БЕЛТА.

Таму што, каб палюбіць, трэба ведаць, якая яна, кім ствараецца. Слухаць — і разумець, чаму такая. Гэта тое, што стала часткай вялікай асветнай дзейнасці Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі, які фактычна стварыў сетку камерных фестываляў у розных кутках краіны. Падчас канцэртаў музыку не толькі іграюць, яе прадстаўляюць як зорку, расказваюць пра аўтараў і тлумачаць кантэкст, у якім яна стваралася. Таму што для нашай культуры разуменне кантэксту мае выключнае значэнне.

У Міхаіла Фінберга адчуванне беларускага кантэксту вельмі тонкае. Час стварэння аркестра супаў з вялікім пераўтварэннямі. І праца гэтага калектыву нібыта апявала стварэнне краіны. Аркестр Фінберга прапанаваў праграмы на вершы беларускіх паэтаў: ад класікаў — Купалы, Коласа, Багдановіча да сучаснікаў — Барадуліна, Гілевіча... Дзейнасці гэтага калектыву і яго кіраўніка наша краіна абавязана існаваннем Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. І калі б аркестр рабіў толькі гэты фестываль, то гэта ўжо была б дастатковая падстава для павагі. Але іх значна больш — ад маленькіх камерных да міжнародных. Больш музыкі, у якой няма падману. І народная любоў. Кветкі і апладысменты.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
tsimoshyk@zviazda.by

■ Вернісаж

# АДЛЮСТРАВАННЕ ЧАСУ

## Падчас персанальнай выстаўкі мастак Кірыл МЕЛЬНІК падзяліўся ўласным светабачаннем

**Біблейскія сюжэты і героі міфалогіі, звыклыя беларускія краявіды і экзотыка субтропікаў, знакавыя ў гісторыі асобы і партрэты, вядомыя вузкаму колу людзей... Разнастайнасць у фарбах, памерах палотнаў і нават тэхніках — менавіта такой бачыцца выстаўка маладога мастака, якая экспануецца ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва.**

Праўда, маладым яго можна назваць хіба толькі па ўзросце. У творчай скарбонцы Кірыла Мельніка — каля 200 жывапісных і 150 графічных работ.

На трэцяй персанальнай выстаўцы мастака прадстаўлены амаль дваццацігадовы перыяд творчай дзейнасці. Самая ранняя работа ў экспазіцыі — партрэт маці. Гэтую карціну Кірыл Мельнік пісаў яшчэ будучы навучэнцам Мінскага мастацкага вучылішча імя Глебава.

Увогуле першая работа ім была створана ў 13-гадовым узросце. Мастацтвам захапіўся яшчэ раней. У студыю, дзе працавалі беларускія мастакі Віктар Варанкевіч і Валерый Гардзіенка, васьмігадовага хлопчыка прывяла старэйшая сястра. У выніку мастакі сталі для яго першымі настаўнікамі.

Але галоўным настаўнікам для Кірыла Мельніка, безумоўна, быў Міхаіл Савіцкі. Партрэт народнага мастака, падораны майстру пры жыцці, таксама можна ўбачыць на выстаўцы. Герой Беларусі часу на асабістыя сустрэчы не шкадаваў — у ходзе шматлікіх гутарак, успамінаў і развагаў ён уводзіў маладога мастака ў асобны замкнёны свет, дастаткова далёкі ад рэальнасці. Міхаіл Савіцкі звычайна скупіўся на пахвалу, але партрэтам застаўся задаволены.

— Міхаіл Андрэевіч мне настойліва раіў эксперыментаваць, шукаць новыя шляхі ў творчасці, не зацыкліваца на пэўным стылі, — гаворыць Кірыл Мельнік, які, дарэчы, працуе ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Менавіта тут на пастаянным захоўванні знаходзіцца і гэты партрэт народнага мастака Беларусі.

Партрэт — адзін з любімых жанраў Кірыла Мельніка. Адлюстроўваючы рысы твару фарбамі, мастак спрабуе перадаць настрой свайго героя, яго характар. А часам і пэўныя эмоцыі — напрыклад, тады, калі Юрый Гагарын ідзе да ўрадавай трыбуны пасля палёту ў космас, ці ў той момант, калі малады Шастаковіч разважае над сваёй першай сімфоніяй. Цікава, што работу асабіста ацаніла трэцяя жонка кампазітара.

Біблейская і міфалагічная тэматыкі прысутнічаюць у больш ранніх работах мастака. Ён пасвойму трактуе вядомыя біблейскія сюжэты, не зусім традыцыйна бачыць місію сваіх галоўных герояў. Па словах Кірыла Мельніка, часам, калі толькі зараджаецца карціна, першы матыў не заўсёды звычайны. Так было з работай «Наш дом». На палатне — выгляд Зямлі з космасу, дзе адлюстраваны яе сімвалы: бацька з сынам, маці з немаўляткам, старая, плён іх працы, ягня, голуб міру.

— У сталым узросце мастак павінен вырашаць больш складаныя задачы, — лічыць мастак. — Савіцкі не раз казаў пра тое, што мастак мусіць адлюстроўваць час, ён нават можа пераварыць імгненне ў вечнасць. Я таксама прытрымліваюся гэтых абстрактных арыенціраў. Фотаздымак — гэта імгненная фіксацыя, карціна ж перадае эпоху.

Дакранецца да эпох, адлюстраваных Кірылам Мельнікам, можна да 5 сакавіка ўключна. Потым выстаўка «пераедзе» ў Прэзідэнцкую бібліятэку.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Вераніка КАНЮТА.**
kanyuta@zviazda.by

■ За падзеяй

# ПАМІЖ ПРОЗАЙ І НАВУКАЙ

## Міжнародны дзень роднай мовы адсвяткавалі ў кнігарні «Вянок»

**Тут правёў сустрэчу з чытачамі доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Іван САВЕРЧАНКА.**

— Сёлета мы ўпершыню запрашаем да сябе аўтара. Падобныя сустрэчы — гэта асветніцкая справа як для супрацоўнікаў кнігарні, так і для слухачоў, — распавядае **загадчыца кнігарні Наталля ЧЫЖЭЎСКАЯ.** — Спадзяюся, што з кожным разам іх фармат будзе толькі пашырацца.

Асноўны напрамак дзейнасці прафесара — філалогія, гісторыя і філасофія. Ён праводзіць навуковыя даследаванні, піша літаратурна-мастацкія і гістарычныя творы.

— Мая праца падобная да працы філолага. Яна марудная і цяжкая. Я вывучаю архівы, гартаю старажытныя дакументы. Шмат часу займае асэнсаванне прачытанага, — распавядае Іван Васілевіч. — Каб добра валодаць тэмай, трэба мець шырэйшыя веды. Раней было больш часу, каб займацца творчай працай і знаходзіць новыя звесткі. Зараз вольнага часу менш, але з'явіўся вопыт і грунтоўныя веды ў параўнанні з тым, што было ў маладыя гады.

Асабліваe месца ў скарбонцы аўтара займае работа «Старажытная паэзія Беларусі XVI — першай паловы XVII ст.». У кнізе сабраны звесткі пра літаратуру таго часу: асноўных пісьменнікаў і іх творы.

— Наяўнасць паэзіі сведчыць пра цывілізаванасць народа, — адзначае Іван Васілевіч. — На нашых землях існавала вялікая культура, у якой гарманічна перапляталіся сацыяльныя і рэлігійныя падзеі. Гэта перыяд поспехаў у гісторыі краіны.

Зусім нядаўна ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыла свет новая гісторыка-мастацкая кніга даследчыка «Улада пячаткі». У ёй узноўлены падзеі старажытнай гісторыі Беларусі, якія звязаны з постацямі Рагвалода, Рагнеды, Усяслава Чарадзея, Міндоўга.

Цудоўнай магчымасцю задаць пытанні госці сустрэчы скарысталіся ў поўнай меры. Пыталіся пра творчыя планы і мары, поспехі падчас вучобы ва ўніверсітэце, цяжкасці працы, навіны ў вобласці літаратуры. Асабліва іх цікавілі праблемы змяншэння колькасці чытачоў і зніжэння ўвагі да новых кніг.

— Літаратура — гэта ўніверсальны інструмент для набыцця ведаў, — адказаў Іван Саверчанка. — Мне падаецца, што чытаць не перастаюць. Толькі змяняецца фармат, форма ўспрымання зместу літаратурнага твора.

**Вікторыя СМАРЫГА**

# Скарына — сімвал дружбы і яднання

## У гімназіі імя Ф. Скарыны ў Вільнюсе адбылася перадача бібліятэчак кніг для беларускай дыяспары ў Літве

Вучні, настаўнікі, госці віленскай гімназіі імя Ф. Скарыны сталі ўдзельнікамі свята, прысвечанага 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Пра тое, якія канферэнцыі, круглыя сталы, семінары, прэзентацыі, выстаўкі праходзяць у сувязі з гэтай датай у Беларусі і ў свеце, расказаў кіраўнік беларускай дэлегацыі, намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алесь Карлюкевіч. Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша прэзентаваў выданні, прысвечаныя Францыску Скарыну і вытокам беларускага, усходнеславянскага кнігадрукавання, якія выйшлі ў апошні час. Адно з выданняў — пра віленскія адрасы беларускага кнігадрукавання. Алесь Суша нагадаў, што ў Вільні ў 1522 годзе выйшла «Малая падарожная кніжыца» Скарыны.

Дарэчы, у горадзе Вільнюсе мясцовыя ўлады абвясцілі 2017 год Годам Францыска Скарыны.

Міністэрства інфармацыі Беларусі перадало дыяспары нашых суайчыннікаў у Літве 6 бібліятэчак культурна-асветніцкай, гістарычнай, мастацкай літаратуры. У кожным з камплектаў па 127 кніг.

**Сяргей ШЫЧКО.**